скаковой: **скаковая лошадь**—бегавы конь.
скала—скала.
скала *(барометра)*—шкала.
скалистый—скалісты.
скалить *(зубы)*—скаліць, шчэрыць, выскаляць.
скалка 1. *(для теста, белья)*—качалка; 2. *тех.*—скалка.
скалывать I *(булавками)*—сашчэпваць.
скалывать II *(лёд)*—абсякаць.
скальпель *мед.*—скальпель.
скальпировать—скальпіраваць.

скамейка 1.—лàўка; 2. *(в комнате)*—заслòн, услòн, зэ̀даль.
скамья—лàўка.
скандал—скандàл.
скандалист—скандалìст, буя̀н.
скандалить—скандàліць, буя̀ніць.
скандальный—скандàльны.
скандинавец—скандынàвец.
Скандинавия—Скандынàвія.
скандинавский—скандынàўскі.
скандировать—скандавàць.
скапывать—скòпваць.
скарб *(домашний)*—пажы̀ткі, скарб.
скаредник—скнара.
скаредничать—скнàрыць.
скаредный—скнàрны.
скарлатина *мед.*—скарлаты̀на.
скарлатинный—скарлаты̀навы.
скармливать—скòрмліваць.
скат I *(склон)*—спад, пакàт, скат.
скат II *(колёс)*—пакòт.
скат III *(крыши)*—схіл, адхòн.
скатать 1. *(в трубку)*—скруціць, згарнỳць; 2. *(белье)*—скачàць.
скатерть—абрỳс, настòльнік скàцертка.
скатистый—спàдзісты, схìлісты, скàцісты.
скатить—скацìць.
скатиться—скацìцца.
скатка—скàтка, скрỳтак.
скатывать 1. *(катить вниз)*—скòчваць; 2. *(в трубку)*—згòртваць, скрỳчваць.
скатываться 1.—скòчвацца; 2.—скрỳчвацца.
скафандр (одежды водолаза и стратонавта)—скафàндр.
скачка *(конский бег)*—бег; скачкі—бягì.
скачок—скачòк.
скашивать I. *(траву)*—скòшваць
скашивать II *(делать косым)*—скòшваць, скасабòчваць.
скважина 1. *(замочная)*—шчы̀ліна, дзірка; 2. *(пора)*—сітавìна; 3. *(буровая)*—шчы̀ліна.
скважистость—дзìрчатасць, сітавìннасць.
скважистый—дзìрчасты, сітавìнны.
сквасить—сквàсіць.
сквер—сквер.
скверно—пагàна, бры̀дка.
сквернословие—бры̀дкія словы, непрыстòйныя слòвы.
сквернословить—гавары̀ць бры̀дкія слòвы, гавары̀ць непрыстòйныя слòвы.
скверный—пагàны, бры̀дкі.
сквозить *(о ветре)*—правявàць, прадувàць, праймàць.
сквозной—скразны̀.
сквозняк—скразня̀к, ця̀га, прòйма, скавы̀ш.
сквозь—скрозь, праз, цèраз.
скворец *зоол.*—шпак.
скворечник—шпакòўня.
скворечница—шпакòўніца.
скворцовый—шпакòвы.
скелет—шкілèт, касця̀к.
скелетный—шкілèтны, касцякòвы.
скепсис *филос.*—скèпсіс.
скептик—скèптык.
скептицизм—скептыцы̀зм.
скептический—скепты̀чны.
скерцо *муз.*—скèрца.
скетч *театр.*—скетч.
скидка—скìдка.
скидывать 1.—скìдваць, скідàць; 2. *(с цены)*—спускàць, збаўля̀ць, зніжàць.
скинуть 1.—скìнуць; 2. *(с цены)*—спусцìць, збàвіць, знìзіць.
скипаться 1.—скіпàцца; 2. *(свертываться)*—збягàцца, адкіпàць.

скипетр—скіпетр.
скипидар—шкіпідàр.
скирда—тарпà, сціртa.
скирдовать—складàць у тòрпы, складàць у сцìрты.
скисать—скісàць, сквàшвацца.
скиснуть—скìснуць, сквàсіцца.
скит *церк.*—скіт.
скиталец—вандрòўнік.
скитальческий—вандрòўніцкі.
скитание—вандравàнне, бадзя̀нне, блукàнне.
скитаться—вандравàць, бадзя̀цца, блукàць.
скиф *истор.*—скіф.
скифский—скìфскі.
склад—склад.
складка 1. (*на платье*)—склàдка; 2. (*на лице, коже*)—маршчы̀на, змòршчына, маршчàк.
складной—складны̀.
складность—склàднасць.
складный—склàдны.
складочный—склàдачны; складочное место—склàдачнае мèсца.
складчина—склàдчына.
склады: читать по складам—слібізавàць.
складывать—склàдваць, складàць.
сkласть—склàсці, злажы̀ць.
склевать—скляваць.
склёвывать—склёўваць.
склеивать—склèйваць.
склеиваться—склèйвацца.
склеить—склèіць.
склейка—склèйка.
склеп 1. (*подвал*)—склеп; 2. (*свод*)—скляпèнне.
склепать—скляпàць.
склёпка *тех.*—склёпка.
склёпывать—склёпваць.
склероз *мед.*—склерòз.
склерома *мед.*—склерòма.
скликать—склікàць.
скликать—склìкаць.
склока—склòка, звàдка.
склон (*горы*)—схіл, адхòн, спад.
склонение 1. *грам.*—скланèнне; 2. *астр.*—адхілèнне.
склонить 1.—схілìць, нахілìць; 2. (*уговорить*)—падгавары̀ць.
склониться—схілìцца, нахілìцца.
склонность—нахìл, нахìльнасць, схìльнасць.
склонный 1.—нахìльны; 2. (*к заболеванию*)—схìльны.
склоняемость *грам.*—скланя̀льнасць.
склоняемый *грам.*—скланя̀льны.
склонять 1.—схіля̀ць; 2. (*уговаривать*)—падгавàрваць; 3. *грам.*—скланя̀ць.
склоняться 1.—схіля̀цца; 2. *грам.*—скланя̀цца.
склочник—склòчнік.
склочница—склòчніца.
склянка—слòік, скля̀нка.
скоба 1. *тех.*—скабà; 2. (*дверная*)—кля̀мка.
скобель *тех.*—скòбля, струг.
скобка *грам., мат.*—дỳжка; заключить в скобки—узя̀ць у дỳжкі.
скоблить—скаблìць, скрэ̀бці, стругàць.
скобяной: скобяные товары—скабяны̀я тавàры.
скованность—скавàнасць, скỳтасць.
скованный—скавàны, скỳты.
сковать—скавàць, скуць.
сковка—скòўка.
сковорода—патэ̀льня.
сковородник—чапялà, чапляя̀.
сковывать—скòўваць.
сколачивать—збівàць.

сколок 1.—скòлак, узор;
2) *(о сходстве)*—кòпія, падабѐнства.
сколотить—збіць.
сколоть I *(булавками)*—сашчапіць.
сколоть II *(лёд)*—абсячы̀.
скольжение—кòўзанне, слізганне.
скользить—кòўзацца, слізгацца.
скользкий—кòўзкі, слізкі.
скользко—кòўзка, слізка.
сколько—кòлькі; сколько угодно—кòлькі хочаш.
скомандовать—скамàндаваць.
скомбинировать—скамбінавàць.
скомкать—скòмкаць, скамячы̀ць.
скоморох—скамарòх, камедыя̀нт, фòкуснік, пая̀ц.
скомпановать—скампанавàць.
скомпрометировать—скампраметавàць.
сконфузить—сканфỳзіць.
сконфузиться—сканфỳзіцца.
сконцентрировать—сканцэнтравàць.
скончаться—сканàць, памѐрці, кòнчыцца.
скопировать—скапіраваць.
скопить—скапіць, сабрàць, назбірàць, назапàсіць.
скопиться—стòўпіцца, згрỳдзіцца.
скопище—стòўпішча, збòрышча.
скопление—стаўплѐнне, згрỳджанне.
скопляться—стòўпліваацца, тòўпіцца, згрỳджвацца.
скорбеть—смуткавàць, сумавàць, тужы̀ць, журы̀цца.
скорбный—смỳтны, сỳмны, тужлівы, журбòтны.
скорбь—смỳтак, тугà, журбà.
скорее, скорей—скарэ̀й, хутчэ̀й, барджэ̀й; как можно скорѐй—як мага хутчэй.
скорлупа 1. *(картофельная)*—лупіна, лупавіна; 2. *(яичная)*—лупіна, шалупà;
3. *(ореховая)*—лушчы̀на, шкарлỳпа.
скормить—скарміць.
скорняжный—кушнѐрскі.
скорняк—кушнер.
скоро—скòра, хỳтка.
скороговорка—скарагавòрка.
скоропалительный—раптòўны.
скоропечатный: скоропечатный станок *тип.*—скарадрукарскі станок.
скорописный—скарапісны.
скоропись—скòрапіс.
скоропостижно—раптòўна.
скоропостижный—раптòўны.
скоропроходящий—хуткамінаючы, скарапрахòдзячы.
скороспелый—скараспѐлы.
скорострельный—скарастрэ̀льны.
скорость—скòрасць, хỳткасць.
скоротечный: скоротечная чахотка—скорацечныя сухоты.
скороход—скарахòд.
скорпион *зоол.*—скарпіён.
скорчить—скỳрчыць, скòрчыць.
скорчиться—скỳрчыцца, скòрчыцца.
скорый—скòры, хỳткі; в скором времені—неўзабаве, у хуткім часе; скорая помощь—хуткая дапамога; скорый поезд—скоры поезд.
скосить 1. *(траву)*—скасіць;
2. *(сделать косым)*—скасіць, скасабòчыць.
скот—жывёла.

скотина — скаціна, жывёла.
скотник—скотнік.
скотный: скотный двор—скотны двор.
скотобойня—разніца, бойня.
скотовод—жывёлавод.
скотоводство—жывёлагадоўля, жывёлаводства.
скотоводческий—жывёлагадоўчы, жывёлаводчы.
скоталечебница—ветэрынарная лячэбніца.
скотопромышленник—жывёлапрамысловец.
скотопромышленный—жывёлапрамысловы.
скотский—жывёльны, быдлячы.
скрадывать *(недостатки)*—утойваць.
скраивать—скройваць.
скрасить *(жизнь)*—упрыгожыць, аздобіць.
скрашивать *(жизнь)*—упрыгожваць, аздабляць.
скребница—скрабло, скрабніца.
скребок—скрабок.
скрежет—скрыгат.
скрежетать—скрыгатаць, скрыгаць.
скрепа *тех.*—скрэпа, зашчэпа.
скрепить—змацаваць, сашчапіць.
скрепка—сашчэпка.
скреплять—змацоўваць, сашчэпваць.
скрести—скрэбці, скрабсці, скрабаць.
скрестить 1.—скрыжаваць; 2. *(биол.)*—злучыць, спараваць.
скрещение 1.—скрыжаванне; 2. *биол.*—злучэнне, спараванне.
скрещивание 1.—скрыжоўванне; 2. *биол.*—злучэнне, спароўванне.
скрещивать 1.—скрыжоўваць; 2. *биол.*—злучаць, спарваць, спароўваць.
скривить—скрывіць.
скривление—скрыўленне.
скрижаль—скрыжаль.
скрип—скрып, рып.
скрипач—скрыпач.
скрипачка—скрыпачка.
скрипение—скрыпенне, рыпенне.
скрипеть—скрыпець, рыпець.
скрипичный—скрыпічны; скрипичный квартет—скрыпічны квартэт.
скрипка—скрыпка.
скрипнуть—скрыпнуць, рыпнуць.
скрипучий—скрыпучы, рыпучы.
скроить—скроіць.
скромник—скромнік, сціплы.
скромничать—скромнічаць.
скромно—скромна.
скромность—скромнасць, сціпласць.
скромный—скромны, сціплы.
скруббер *тех.*—скрубер.
скрупул *анат.*—скрупул.
скрупулёзный—скрупулёзны.
скрутить—скруціць.
скрученный—скручаны.
скручивать—скручваць.
скрывать—скрываць, хаваць, захоўваць.
скрываться—хавацца, таіцца.
скрытничать—скрытнічаць.
скрытность—скрытнасць, патаемнасць.
скрытный—скрытны, патаемны.
скрытый—скрыты, схаваны, захаваны.
скрыть—скрыць, схаваць, захаваць.

скрыться—знікнуць, скрыцца.
скрючиваться—скарэжвацца, скорчвацца.
скряга—скнара.
скряжничать—скнарыць.
скряжничество—скнарнасць.
скудность—беднасць, мізэрнасць.
скудный—бедны, мізэрны.
скудоумие—прыдуркаватасць.
скука—нуда, маркота.
скула *анат.*—скула.
скуластый—скуласты.
скулить 1. *(о собаке)*—скуголіць, скогліць;
2. *фиг. (о человеке)*—ныць, енчыць.
скульптор—скульптар.
скульптура—скульптура.
скульптурный—скульптурны.
скумбрия *зоол.*—скумбрыя.
скупать—скупляць.
скупец—скнара.
скупить—скупіць.
скупиться—скупіцца, скнарыцца.
скупка—скупка, скупляние.
скупо—скупа.
скуповатый—скупаваты.
скупой—скупы, скнара.
скупость—скупасць, скнарнасць.
скупщик—скупшчык.
скупщица—скупшчыца.
скучать—нудзіцца, маркоціцца, сумаваць.
скученность—скучанасць, згруджанасць.
скученный—скучаны, згруджаны.
скучно—нудна, сумна, маркотна.
скучноватый—нуднаваты, сумнаваты, трохі маркотны.
скучный—нудны, сумны, маркотны.
скушать—з'есці.
слабеть—слабець.
слабительное—слабіцельнае.
слабить *мед.*—слабіць.
слабо—слаба.
слабоватый—слабаваты.
слабовольный—слабавольны.
слабогрудый—слабагруды.
слабосильный—слабасільны, нядужы.
слабость—слабасць, кволасць, млявасць.
слабоумие—слабы розум.
слабоумный—слабы на розум.
слабохарактерность—слабахарактарнасць.
слабохарактерный—слабахарактарны.
слабый—слабы.
слава 1.—слава, хвала;
2. *(слух)*—чутка, пагалоска.
славист—славіст.
славить—славіць.
славиться—славіцца.
славно—слаўна.
славный—слаўны.
славословить—славасловіць.
славянизм—славянізм.
славянин—славянін.
славянофил—славянафіл.
славянофоб—славянафоб.
славянский—славянскі.
слагаемое *мат.*—складнік.
слагать—складаць.
сладить—зладзіць.
сладкий—салодкі.
сладко—салодка, соладка.
сладковатый—саладкаваты.
сладкозвучный—салодкагучны.
сладкоречивый—салодкамоўны.
сладости—прысмакі.
сладостно—асалодліва, прыемна.
сладостный—асалодны, прыемны.

сладострастие—сладастрàснасць.
сладострастный—сладастрàсны.
сладость—слòдыч, салòдкасць.
сланец *мин.*—сланèц.
сласти—прысмàкі, ласỳнкі.
сластить—саладзіць, засалòджваць.
сластолюбивый—квàпны на ласỳнкі.
слащавость—саладжàвасць.
слащавый—саладжàвы.
слаще—саладзèй.
слева—злева.
слегка—злёгку.
след—след.
следить—сачы̀ць, пільнавàць.
следование 1. *(войск)*—прахаджэнне; 2. *(поездов)*—слèдаванне.
следователь *юр.*—слèдчы.
следовательно—выхòдзіць, знàчыць, знàчыцца.
следовать 1. *(за кем)*—ісцì слèдам, ісцì ў след; 2. *(вытекать)*—выхòдзіць, вынікàць; 3. *(примеру)*—пераймàць *(прыклад)*.
следом—слèдам, услèд, нàзіркам.
следствие *юр.* 1.—слèдства, дазнàнне; 2. *(результат)*—вы̀нік.
следуемый—налèжны, налèжачы.
следующий—настỳпны; на следующий день—на другі дзень, на наступны дзень.
слежаться—злèжацца, зляжàцца, уляжàцца.
слеживаться—злèжвацца, улèжвацца.
слежка—сачэнне, падпільнòўванне.
слеза—слязà.
слезать—злàзіць.
слезиться—слязіцца.
слезливость—слязлівасць.
слезливый—слязлівы.
слёзный—слёзны.
слёзотечение *мед.*—слёзацячэнне.
слёзоточивый *воен., хим.*—слèзацèчны, слёзагòнны.
слезть—злèзці.
слезящийся—які слязіцца.
слепень *зоол.*—сляпèнь.
слепец—сляпèц, невідỳшчы.
слепить I. *(делать слепым)*—сляпіць, асляплàць.
слепить II. *(о лепке)*—зляпіць.
слепнуть—слèпнуць.
слепо—слèпа.
слеповатый—слепавàты, недабàчлівы.
слепой—сляпы̀, невідỳшчы.
слепок—злèпак.
слепорождённый—слепанарòджаны, сляпы̀ ад рòду.
слепота—слепатà.
слесарная *(мастерская)*—слясàрня.
слесарничать—слесаравàць.
слесарный—слясàрны.
слесарь—слёсар.
слёт—злёт.
слетать—злятàць.
слетаться—злятàцца.
слететь—зляцèць.
слететься—зляцèцца.
слечь—злèгчы.
слива—слìва.
сливать—злівàць.
сливаться—злівàцца.
сливки—вяршкì, смятàнка, злìўкі.
сливной: сливной пункт—злìўны пункт.
сливовый—слівяны̀.
сливочный—слìвачны; сливочное масло—сметанкòвае масла.
слизать—злізàць.
слизень *зоол.*—смòўж, слìмень, слімàк.

слизистый: слизистая оболочка—слізістая абалонка.
слизывать—злізваць.
слизь—слізь.
слинять—зліняць.
слипаться—зліпацца.
слипнуться—зліпнуцца.
слитие—зліццё.
слитно—злітна, злучана, разам.
слитный—злітны, злучаны; слитное предложение *грам.*—злучаны сказ.
слиток—злітак.
слить—зліць.
слиться—зліцца.
сличать—звяраць, раўнаць.
сличение—звярэнне, параўнанне, параўноўванне.
сличить—звёрыць, параўнаць.
слишком—надта.
слияние 1.—зліццё; 2. *(рек)*—сутока.
слобода—слабада.
словак—славак.
словарный—слоўнікавы.
словарь—слоўнік.
словацкий—славацкі.
словенец—славенец.
словенский—славенскі.
словесник—славеснік.
словесно—слоўна, на словах.
словесность—славеснасць.
словесный—славесны, слоўны.
словечко—слоўца.
словно—нібы, быццам, нібыта.
слово—слова.
словолитня—словалітня.
словообразование *грам.*—славаўтварэнне.
словоохотливость—гаварлівасць.
словоохотливый—гаваркі.
словопроизводство *грам.*—слававытварэнне.
словосочетание—славаспалучэнне.
словотолкование—тлумачэнне слоў.
словоупотребление—славаўжыванне.
словцо—слоўца; красное словцо—прыгожае слоўца.
слог 1. *грам.*—склад; 2. *(стиль)*—стыль.
слоговой—складовы.
слоение—слаенне.
слоёный—слаісты, слаёны.
сложение 1. *мат.*—складанне; 2. *(телосложение)*—стан, склад.
сложенный—зложаны, складзены.
сложить—злажыць, скласці.
сложиться—злажыцца, скласціся.
сложно—складана.
сложность—складанасць.
сложный—складаны.
слоистость—слаістасць.
слоистый—слаісты.
слоиться—слаіцца.
слой—слой.
слом—злом.
сломанный—зламаны.
сломать—зламаць.
сломить—зламаць.
слон *зоол.*—слонь, слон.
слоновый—сланёвы, сланова.
слоняться—сланяцца, сноўдацца, туляцца.
слуга—слуга.
служака—служака.
служанка *уст.*—служанка.
служащий—служачы.
служба—служба.
служебный—службовы.
служение—служэнне.
служитель *(культа)*—служыцель, паслугач.
служить—служыць.
слукавить—схітраваць.
слух 1.—слух, слых; 2. *(молва)*—чутка, пагалоска.

слуховой—слухавы̀, слыхавы̀.
Слуцк—Слу̀цк, Слу̀цак.
случай—вы̀падак, здарэ̀нне; в этом случае — у гэтым выпадку; в противном случае—у адваротным выпадку; во всяком случае—у кожным выпадку, ва ўсякім выпадку; на всякий случай — на кожны выпадак, на ўсякі выпадак; по слу̀чаю—выпадкова, з прычыны, у сувязі; непредвиденный случай—непрадбачаны выпадак; при случае—пры выпадку; по случаю чего—з прычыны чаго, у сувязі з чым; воспользоваться случаем—скарыстаць выпадак; в худшем случае—у горшым выпадку; ни в коем случае—ні ў якім выпадку, ні ў якім разе.
случайно — вы̀падкам, выпадкова.
случайность— выпадко̀васць.
случайный—выпадко̀вы.
случать—злуча̀ць, спаро̀ўваць.
случаться I.—трапля̀цца, здара̀цца, прыхо̀дзіцца, даво̀дзіцца.
случаться II. *(о животных)*—злуча̀цца, спаро̀ўвацца.
случить—злу̀чыць, спарава̀ць.
случиться I.—тра̀піцца, зда̀рыцца.
случиться II. *(о животных)*—злучы̀цца, спарава̀цца.
случка—злу̀чка, спарава̀нне, спаро̀ўванне.
случной—злу̀чны.
слушание *юр. (дела)*—слу̀ханне.
слушатель—слуха̀ч.
слушательница—слуха̀чка.
слушать—слу̀хаць.
слушаться—слу̀хацца, слу̀хаць.
слыть—сла̀віцца.
слышать—чуць.
слышаться—чу̀цца.
слышимость—чу̀тнасць.
слышимый—чу̀тны.
слышно—чу̀тна, чува̀ць.
слышный—чу̀тны.
слюда *мин.*—слю̀да.
слюдяной—слюдзяны̀.
слюна—сліна.
слюнить—сліні̇ць.
слюнтяй—слюнця̀й.
слякоть—сло̀та, халѐпа.
смазать—зма̀заць.
смазка 1. *(вещество)*—зма̀зка; 2. *(смазывание)*—зма̀званне.
смазливость—го̀жасць, прыго̀жасць тва̀ру.
смазливый—го̀жы, прыго̀жы з твару.
смазочный—зма̀зачны.
смазчик *ж.-д.*—зма̀зчык.
смазывание—зма̀званне.
смазывать—зма̀зваць.
смаковать—смакава̀ць, каштава̀ць.
смальц—шма̀лец.
сманивать—прына̀джваць, прыва̀бліваць.
сманить—прына̀дзіць, прыва̀біць.
смарка: все пошло насмарку—усё пайшло прахам, усё марна прапала.
смастерить—змайстрава̀ць.
сматывание—змо̀тванне, зві̇ва̀нне.
сматывать—змо̀тваць, звіва̀ць.
смахивать *(пыль)*—сціра̀ць; смахивать на кого-либо—быць падобным на каго-небудзь.
смахнуть—сцѐрці.
смачивать—змо̀чваць, мачы̀ць.
смачиваться—змо̀чвацца.

смежность—сумѐжнасць, памѐжнасць.
смежный—сумѐжны, памѐжны.
смекалка *разг.*—кѐмнасць, ця̀мкасць.
смекать—кѐміць, ця̀міць.
смекнуть—скѐміць, сця̀міць.
смелей—смялѐй.
смелеть—смялѐць.
смело—смѐла.
смелость—смѐласць, адва̀га.
смелый—смѐлы, адва̀жны.
смельчак—смяльча̀к.
смена—змѐна.
сменить—змяніць.
сменный—змѐнны.
сменовеховец—зменавѐхавец.
сменяемость—змяня̀льнасць.
сменяемый—які змяня̀ецца, змяня̀льны.
сменять—змяня̀ць.
смерить—змѐраць; **смерить глазами**—акінуць вокам.
смеркаться—змярка̀цца, сутанѐць, вечарэ̀ць.
смертельно—смяро̀тна, смярта̀льна.
смертник—смяро̀тнік, смѐртнік.
смертность—смяро̀тнасць, смѐртнасць.
смертный—смяро̀тны, смертны; **смертная казнь**—кара смерцю, пакаранне смерцю.
смертоносный—згу̀бны, смяро̀тны.
смерть—смерць.
смерч—смерч.
смести—змясці̀, зме́сці.
сместить *(с должности)*—зняць, зво̀ліць, зво̀льніць.
смесь—су̀месь.
смета—каштары̀с.
сметана—смята̀на.
сметать I. *(пыль)*—змята̀ць.
сметать II. *(стог)*—скідаць, скла̀сці, састажы̀ць (сена).
смётка—кѐмнасць, кѐмкасць, ця̀мкасць.
сметливость—кѐмнасць, кѐмкасць, ця̀мкасць.
сметливый—ця̀мкі, кѐмны, кѐмкі.
сметный—каштары̀сны.
сметь—смець, асмѐльвацца, адва̀жвацца.
смех—смех.
смехотворный—смехатво̀рны, смяхо̀тны.
смешанный—змѐшаны.
смешать 1.—змяша̀ць; 2. *(спутать разнородные понятия)*—зблы̀таць.
смешаться 1.—змяша̀цца; 2. *(спутаться)*—зблы̀тацца.
смешение 1.—змяша̀нне; 2. *(разнородных понятий)*—блытаніна.
смешивать 1.—змѐшваць; 2. *(путать разнородные понятия)*—блы̀таць.
смѐшить—смяшы̀ць.
смешливый—смехатлі̀вы, смяшлі̀вы.
смешно—смѐшна.
смешной—смѐшны.
смещать *(с должности)*—звальня̀ць.
смещение 1. *(с должности)*—звальнѐнне, 2. *геол.*—зру̀шванне, зрушэ̀нне.
смеяться—смяя̀цца, кпіць (з каго).
смиловаться—злі̀лавацца, злітава̀цца.
смирение—пако̀ра.
смиренно—пако̀рна, пако̀рліва.
смиренный—пако̀рны, пако̀рлівы.
смирительный: смирительная рубашка—вар'яцкая кашуля.
смирить—уціхамі̀рыць.
смирно—ціха, смі̀рна; *(команда)*—зважа̀й!

смирный—ціхі, рахманы.
смирять—уціхамірваць.
смоковница—смакоўніца, фігавае дрэва.
смола—смала.
Смолевичи *(м-ко)*—Смалявічы.
смолистый—смалісты; **смолистое полено**—**смаляк**.
смолить—**смаляваць**.
смолкать—**змаўкаць**.
смолкнуть—**змоўкнуць**, **сціхнуць**.
смолкший—**змоўклы**, **змоўкшы**.
смоловарня—смалярня, смалакурня.
смолоду—змоладу, з маладых гадоў.
смолокур—смалакур.
смолокурение—смалакурэнне, смалярства.
смолоть—змалоць.
смолчать—змоўчаць.
смоль: чёрный как смоль—чорны як смала.
смоляной—смаляны.
сморкать—смаркаць.
сморкаться—смаркацца.
смородина *бот.*—смуродзіна, парэчкі.
сморчок *(гриб)*—смаржок, весялок.
сморщенный—зморшчаны.
сморщить—зморшчыць.
сморщиться—зморшчыцца.
смотать—зматаць, звіць.
смотр—агляд.
смотреть 1.—глядзець; 2. *(за кем, чем)*—даглядаць, наглядаць.
смотреться—глядзецца.
смотрины—аглядзіны.
смотритель—даглядчык, наглядчык.
смочить—змачыць.
смочь—змагчы, здолець.
смрад—смурод.
смуглолицый—смуглатвары.
смуглый—смуглы, смуглявы.
смута—смута.
смутить—збянтэжыць.
смутиться—збянтэжыцца.
смутно—смутна, няясна, невыразна.
смутный *(о понятии, представлении)*—смутны, няясны, невыразны.
смутьян—чмут, баламут.
смущать—бянтэжыць.
смущаться—бянтэжыцца.
смущение—збянтэжанасць.
смущённый—збянтэжаны.
смывать—змываць.
смываться—змывацца.
смыкать 1. *(глаза)*—зводзіць, прыплюшчваць, заплюшчваць; 2. *(ряды) воен.*—змыкаць, злучаць.
смыкаться—злучацца, змыкацца.
смысл—сэнс.
смыслить—разумець, цяміць, кеміць.
смыть—змыць.
смычка—змычка.
смычковый *муз.*—смычковы.
смычок—смычок.
смышлённость—цямкасць, кемкасць.
смышлённый—цямкі, кемкі.
смягчать—змякчаць, памякчаць.
смягчаться—змякчацца, памякчацца.
смягчающий—змякчаючы, памякчаючы.
смягчение—змякчэнне, памякчэнне.
смягчённый—змякчоны, памякчоны.
смятение—перапалох, сполах; **привести в смятение**—напалохаць, перапалохаць.
смятка: **в смятку**—у смятку.
смять—змяць.

снабдить—снабдзіць, забяспѐчыць.
снабжать—снабжàць, забяспѐчваць.
снабжение—снабжэнне, забеспячэнне.
снабженческий—снабжэнцкі.
снадобье—прыправа, прысмàкі.
снайпер—снайпер.
снаружи—знадвòрку, звòнку.
снаряд *воен.*—снарàд.
снарядить 1. (*телегу*)—налàдзіць, нарыхтавàць; 2. (*в дорогу*)—сабрàць, нарыхтавàць.
снарядный—снарàдны.
снаряжать 1. (*телегу*)—налàджваць, нарыхтòўваць; 2. (*в дорогу*)—збіраць, нарыхтòўваць.
снаряжение 1.—снаражэнне, прыпàсы; 2. (*действие*)—збірàнне, рыхтавàнне.
снасть—снàсць.
сначала—спачàтку, спяршà.
снег—снѐг.
снегирь *зоол.*—гіль, снігір.
снеговой—снегавы.
снегоочиститель—снегаачысціцель.
снегопад—снегапàд.
снедь—патрàва, стрàва, ядà. ѐжа.
снежинка—сняжынка.
снежки—снѐжкі.
снежный—снѐжны.
снежок—сняжòк.
снесение—знясѐнне.
снести 1.—знясці, знѐсці; 2. (*обиду*)—сцярпѐць; 3. (*занести*)—занéсці.
снестись 1.—знѐсціся; 2. (*установить связь*)—налàдзіць сувязь, спісàцца.
снеток (*рыба*)—снітòк.
снижать 1.—зніжàць, спускàць; 2. (*цену*)—зніжàць, збаўлàць.
снижаться 1.—зніжàцца, спускàцца; 2. (*о цене*)—зніжàцца, збаўлàцца.
снижение—зніжэнне.
снизать—знізàць.
снизойти—уступіць, уважыць.
снизу—знізу.
снимать—здымàць, знімàць; 2. (*одежду*)—распранàць, здымàць; 3. (*квартиру, помещение*)—наймàць.
сниматься—здымàцца, знімàцца.
снимок—здымак, знімак.
снискать: снискàть располо жение—увайсці ў ласку.
снисходительно—спагàдліва, міласліва, ласкàва.
снисходительность—спагàдлівасць, міласлівасць, ласкàвасць.
снисходительный—спагàдлівы, міласлівы, ласкàвы.
снисходить—уступàць, рабіць ласку.
снисхождение—спагàда, міласць, лàска.
сниться—сніцца.
СНК (*Совет народных комиссаров*)—СНК (*Совет народных камісараў*)
снобизм—снабізм.
снова—знòў, ізнòў, нанòва.
сновать 1. (*пряжу*)—снавàць; 2. (*ходить взад и вперед*)—снòўдацца, швэндацца.
сновидение—сон, сны.
сногсшибательный—галавакрўжны.
сноп—сноп.
сноповязалка—снопавязàлка.
сноровка—звычка.
снос—знос.
сносить 1.—знòсіць; 2. (*обиду*)—цярпѐць.

сноситься (*с кем*)—зносіцца, мець зносіны.
сноска (*в книге*)—зноска, вынаска.
сносно—зносна, нішто.
сносный—зносны, ніштаваты.
снотворный—снатворны.
сноха—сынавая, нявестка.
сношение—зносіны.
СНР (*Секция научных работников*)—СНР (*Секцыя навуковых работнікаў*).
снюхаться *фиг.*—знюхацца.
снятие—зняцце.
снятой: снятое молоко—зняттае малако.
снять 1.—зняць; 2. (*одежду*) — распрануць, зняць; 3. (*квартиру, помещение*)—наняць.
соавтор—сааўтар.
собака—сабака (*мужч. р.*).
собачий—сабачы.
собачка—сабачка.
собачёнка—сабачка.
собес (*социальное обеспечение*)—сацыяльная забяспека.
собеседник—субяседнік.
собеседница—субяседніца.
собеседование—субяседванне, гутарка.
собирание—збіранне.
собиратель—збіральнік.
собирательный—збіральны; собирательное имя существительное *грам.*—зборны назоўнік.
собирать 1.—збіраць; 2. (*машину*)—складаць, збіраць.
собираться—збірацца.
собкор (*собственный корреспондент*)—уласны карэспандэнт.
соблаговолить *уст.*—зрабіць ласку.
соблазн—спакуса.
соблазнитель—спакуснік.
соблазнительница—спакусніца.
соблазнительный—спакусны, спакуслівы.
соблазнить—спакусіць.
соблазниться—спакусіцца.
соблазнять—спакушаць.
соблазняться—спакушацца.
соблюдать 1. (*порядок, чистоту*)—захоўваць, пільнавацца (*парадку, чыстаты*); 2. (*закон*)—выконваць закон, трымацца (*закона*).
соблюдение 1.—захаванне, захоўванне; 2. (*закона*)—выконванне, выкананне.
соблюсти 1. (*порядок, чистоту*)—захаваць; 2. (*закон*)—выканаць.
соболезнование—спачуванне.
соболезновать—спачуваць.
соболий—сабалёвы, сабаліны.
соболь *зоол.*—собаль.
собор 1. (*здание*)—сабор; 2. (*собрание, съезд*) *истор.*—збор, з'езд.
собрание 1.—сход; 2. (*сочинений*)—збор (*твораў*).
собрат—сабрат.
собраць 1.—сабраць, назбіраць; 2. (*машину*)—скласці, сабраць.
собраться—сабрацца, сыйсціся.
собственник—уласнік.
собственница—уласніца.
собственнический—уласніцкі.
собственно—уласна; собственно говоря—уласна кажучы.
собственноручный—уласнаручны.
собственность—уласнасць.
собственный—уласны; собственное имя *грам.*—уласнае імя.
событие—падзея.
сова *зоол.*—сава.
соваппарат (*совецкий аппарат*)—соўапарат (*совецкі апарат*).

совать—сòваць, сỳнуць.
совершать—рабіць, чыніць, учыняць.
совершаться—рабіцца, учыняцца.
совершение—учыненне.
совершенно—зусім, цàлкам.
совершеннолетие—поўналèцце, дарòсласць.
совершеннолетний—поўналèтні, дарòслы.
совершенный—даскан̀алы, даскан̀альны; совершенный вид *грам.*—закòнчанае трыванне, закòнчаны від.
совершенство—даскан̀аласць, даскан̀альнасць; в совершенстве—дасканала, дасканальна.
совершенствовать—удасканальваць.
совершенствоваться—удасканальвацца.
совершить—зрабіць, учыніць.
совершиться—зрабіцца, учыніцца, адбыцца, здàрыцца.
совеститься—сòвесціцца, сарòміцца.
совестно—сòвесна, сòрамна.
совестный—сòвесны, сумлèнны.
совесть—сòвесць, сумлèнне; угрызение совести—скрухà.
совет I. (*наставление*)—рàда, парàда.
совет II. (*учреждение*)—совèт; совет труда и обороны—совет працы і абароны.
советизация—советызàцыя.
советизироваться—советызавàцца.
советизм—советызм.
советник *уст.*—савèтнік.
советовать—рàдзіць, рàіць.
советоваться—рàдзіцца, рàіцца.
советский—совèцкі.
советчик—парàдчык, дарàдчык.
совещание—нарàда.
совещательный—дарàдчы.
совещаться—рàдзіцца.
совиный—савіны.
совка *зоол.*—сòўка.
совладать—спрàвіцца, здòлець, адòлець.
совладелец—суўладàльнік.
совладение—супольнае ўладàнне.
совместимость—сумяшчàльнасць.
совместимый—сумяшчàльны.
совместитель—сумяшчàльнік.
совместительство—сумяшчэнне.
совместить—сумясціць.
совместно—сумèсна, супòльна.
совместный—сумèсны, супòльны.
совмещать—сумяшчàць.
совмещение—сумяшчэнне.
Совнарком (*Совет народных комиссаров*)—Соўнаркòм (*Совет народных камісараў*).
совнаркомовский—соўнаркòмаўскі.
совок—савòк.
совокупность—супòльнасць, сукỳпнасць.
совокупный—супòльны, сукỳпны.
совпадать—супадàць.
совпадение—супадзèнне.
совпартшкола—соўпартшкòла.
совпасть—супàсці.
совработник—соўрабòтнік.
совратитель—спакушàльнік, спакỳснік.
совратить—спакусіць.
соврать—схлусіць.
совращать—спакушàць.

совращение—спакушэнне, спакуса.
современник —сучаснік.
современность—сучаснасць.
современный—сучасны.
совсем—зусім, саусім, цалкам.
совучреждение (*советское учреждение*)—соўустанова (*савецкая ўстанова*).
совхоз (*советское хозяйство*)—соўгас (*савецкая гаспадарка*).
совхозный—соўгасны.
согбённый *уст.*—згорблены, сагнуты, пахілы.
согласие—згода.
согласиться—згадзіцца.
согласно 1. (*мирно*)—згодна, у згодзе; 2. (*с чем*)—паводле (*чаго*), згодна (*з чым*).
согласный—згодны; согласный звук *грам.*—зычны гук.
согласование 1.—узгадненне; 2. *грам.*—дапасаванне.
согласованность 1.—узгодненасць; 2. *грам.*—дапасаванасць.
согласованный 1.—узгоднены; 2. *грам.*—дапасаваны.
согласовать 1.—узгадніць; 2. *грам.*—дапасаваць.
согласоваться 1.—адпавядаць; 2. *грам.*—дапасавацца.
согласовывать 1.—узгадняць; 2. *грам.*—дапасоўваць.
согласовываться—узгадняцца.
соглашатель—згоднік.
соглашательский—згодніцкі.
соглашательство—згодніцтва.
соглашаться—згаджацца, пагаджацца.
соглашение—згода, пагадненне.
соглядатай *уст.*—выведнік.
согнать—сагнаць, пазганяць.
согнутый—сагнуты.
согнуть—сагнуць.
согнуться—сагнуцца.
согражданин—суграмадзянін.
согревание—саграванне.
согревательный—сагравальны.
согревать—саграваць.
согреваться—сагравацца.
согреть—сагрэць.
согреться—сагрэцца.
согрешить—зграшыць, саграшыць.
сода *хим.*—сода.
содействие—садзейнасць, дапамога.
содействовать—садзейнічаць, дапамагаць.
содержание 1. (*книги, статьи*)—змест; 2) (*семьи*)—утрыманне.
содержатель—утрымальнік.
содержательница—утрымальніца.
содержательно—змястоўна, багата змëстам.
содержательность—змястоўнасць.
содержательный—змястоўны, багаты змëстам.
содержать 1. (*иметь на иждивении*)—утрымліваць, утрымоўваць; 2. (*заключать в себе*)—змяшчаць.
содержимое—змесціва.
содержимость—змяшчальнасць.
содовый—содавы.
содоклад—садаклад.
содокладчик—садакладчык.
содом—садом, вэрхал.
содрать—садраць, здзерці, злупіць.
содрогание—уздрыг.
содрогаться—уздрыгацца.
содрогнуться—уздрыгануцца, уздрыгнуцца.
соевый *бот.*—соевы.
соединение—злучэнне.

соединённый—злу̀чаны.
соединительный—злучàльны.
соединить—злучы̀ць.
соединиться—злучы̀цца.
соединять—злучàць.
соединяться—злучàцца.
Сож—Сож.
сожаление—жаль; к сожалению—на жаль.
сожалеть—шкадавàць, жалкавàць.
сожжение—спалѐнне.
сожжённый—спàлены.
сожитель—сажы̀цель.
сожительница—сажы̀целька.
сожительство—сужыццё.
сожрать *вульг.*, *разг.*—зжэ̀рці.
созвать—склі̀каць, сазвàць.
созвездие *астр.*—сузо̀р'е.
созвониться—сазванì цца.
созвучие—сугу̀чнасць.
созвучный—сугу̀чны.
создавать—ствараць.
создание 1.—стварэ̀нне; 2. (*действие*)—тварэ̀нне, стварэ̀нне.
создатель—тварэ̀ц, тво̀рца.
создать—ствары̀ць.
созерцание—сузірàнне.
созерцатель—сузірàльнік.
созерцательный—сузірàльны.
созерцать—сузірàць.
созидание—тварэ̀нне, будавàнне.
созидатель—тварэ̀ц, будау̀нік.
созидательный—тво̀рчы, будау̀нічы.
созидать—твары̀ць, будавàць.
сознавать—усведамля̀ць, сазнавàць.
сознаваться—сазнавàцца, прызнавàцца.
сознание—сазнàнне.
сознательно—свядо̀ма, лишиться сознания—страціць прыто̀мнасць; притти в сознание—апрыто̀мнець.
сознательность—свядо̀масць.
сознательный—свядо̀мы.
сознать—усвядо̀міць, сазнàць.
сознаться—сазнàцца, прызнàцца.
сознающий—які сазнаѐ, які у̀сведамля̀е.
созревание—паспявàнне, выспявàнне, даспявàнне.
созревать—паспявàць, выспявàць, даспявàць.
созревший—паспѐлы, даспѐлы.
созреть—паспѐць, вы̀спець, даспѐць.
созыв—склікàнне.
созывать—склікàць.
созываться—склікàцца.
соизволение—дазво̀л, дазвалѐнне.
соизволить—зрабіць лàску.
соизмеримость—сузмѐрнасць.
соизмеримый—сузмѐрны.
соискание—канкурэ̀нцыя, спабо̀рніцтва.
соискатель—канкурэ̀нт, спабо̀рнік.
сойка *зоол.*—со̀йка.
сойти—сыйсці̀, зыйсці̀; сойти с ума—звар'яцѐць.
сойтись—сыйсці̀ся.
сок—сок.
сокол—со̀кал.
сократимый—скарачàльны.
сократить—скараці̀ць.
сократиться—скараці̀цца.
сокращать—скарачàць.
сокращаться—скарачàцца.
сокращение—скарачэ̀нне.
сокращённо—скаро̀чана.
сокращённый—скаро̀чаны.
сокровенный—патаѐмны.
сокровище—скарб.
сокровищница—скàрбніца.
сокрушать—знішчàць.
сокрушаться—журы̀цца, тужы̀ць, сумавàць.
сокрушение 1.—знішчэннѐ; 2. *перен.*—засмучэ̀нне.

сокрушить—знішчыць.
сокрушительный—знішчальны.
сокрытие *юр.*—сукрыццё.
солгать—схлусіць.
солдат—салдат.
солдатка—салдатка.
солдатский—салдацкі.
солевар—салявар.
солеварня—салярня, салярня.
соление—саленне.
солёный—салёны, салоны.
солидаризироваться—салідарызавацца.
солидарно—салідарна.
солидарность—салідарнасць.
солидарный—салідарны.
солидность—саліднасць.
солидный—салідны, паважны, сталы.
солист—саліст.
солитер *мед.*—салітэр.
солить—саліць.
солнечный—сонечны.
солнце—сонца.
солнцепёк—сонцапрыпёк.
солнцестояние—сонцастаянне.
солнышко—сонейка.
соло *муз.*—сола.
соловей—салавей.
соловьиный—салаўіны.
солод—солад.
солодить—саладзіць.
солодовый—саладовы.
солома—салома.
соломенный—саломенны.
соломинка—саломінка.
соломорезка—сячкарня.
соломотряс—саломатрас.
солонина—саланіна, салонае мяса.
солонка—салянка.
солоноватый—саланаваты.
солончак—саланчак.
соль I.—соль.
соль II. *муз.*—соль.
сольный—сольны.
солянка (*кушанье*)—салянка.
соляной—саляны.
сом *зоол.*—сом.
сомкнутый—самкнуты, злучаны; сомкнутый строй *воен.*—самкнуты строй.
сомкнуть 1. (*глаза*)—прыплюшчыць, заплюшчыць; 2. (*ряды*)—злучыць, самкнуць.
сомлеть—самлець, абамлець.
сомневаться—сумнявацца.
сомнение—сумненне.
сомнительно—няпэўна.
сомнительность—няпэўнасць.
сомнительный—няпэўны.
сомножитель *мат.*—сумножнік.
сон—сон.
соната *муз.*—саната.
сонет *лит.*—санет.
сонливость—санлівасць.
сонливый—санлівы.
сонный—сонны.
соображать 1.—меркаваць; 2. (*понимать*)—разумець, цяміць.
соображаться (*с чем*)—зважаць (*на што*), прыстасоўвацца (*да чаго*).
соображение—меркаванне, погляд; принять в соображение—узяць пад увагу.
сообразительность—кемнасць, кемлівасць, цямлівасць.
сообразительный—кемкі, кемлівы, цямлівы.
сообразить—уразумець, уцяміць.
сообразно—адпаведна, згодна.
сообразность—адпаведнасць, згоднасць.
сообразный—адпаведны, згодны.

сообразовать—прывѐсці ў адпавѐднасць, узгòдніць.
сообразоваться—мець на ўвàзе, прынàць пад увàгу.
сообразовывать—узгаднàць.
сообразовываться—браць пад увàгу, мець на ўвàзе, узгаднàцца.
сообща—рàзам, супòльна.
сообщать—паведамлàць *(каго)*, накàзваць *(каму)*.
сообщаться (*с кем*)—знòсіцца, мець знòсіны.
сообщение 1. *(чего)*—паведамлѐнне, абвяшчэнне; 2. *(с кем)* знòсіны, сўвязь; **пути сообщения**—шляхі зносін.
сообщество—сутаварыства, кампàнія, хаўрўс.
сообщительность—сутаварыскасць.
сообщительный—сутаварыскі.
сообщить—павѐдаміць *(каго)*, наказàць *(каму)*.
сообщник—супòльнік, удзѐльнік, хаўрўснік.
сообщница—супòльніца, удзѐльніца, хаўрўсніца.
сообщничество—супòльства, хаўрўс.
соорудить—збудавàць, пабудавàць.
сооружать—будавàць.
сооружение 1.—будавàнне, пабудòва; 2. *(здание)*—будынак, будыніна, будòўля.
соответственно—адпавѐдна, згòдна.
соответственный—адпавѐдны, згòдны.
соответствие—адпавѐднасць.
соответствовать—адпавядàць.
соответствующий—адпавядàючы.
соотечественник—зямлàк, сурòдзіч.
соотносительность—суаднòснасць.
соотносительный—суаднòсны.
соотношение—суаднòсіны.
соперник—сапѐрнік.
соперница—сапѐрніца.
соперничать—сапѐрнічаць.
соперничество—сапѐрніцтва.
сопеть—сапці.
сопка—сòпка.
соплеменник—аднаплямѐннік, супламѐннік.
соплеменница—аднаплямѐнніца, супламѐнніца.
сопли—смаркачы.
сопло *тех.*—сòпла.
соподчинённый—супадлѐглы, супадначàлены.
сопоставить—супаставіць, параўнàць.
сопоставление—супастаўлѐнне, параўнàнне.
сопоставлять—супастаўлàць, параўнòўваць.
сопрано *муз.*—сапрàна.
сопредельный—сумѐжны.
сопреть—сапрэць.
соприкасание—дòтык, дакранàнне.
соприкасаться—датыкàцца, дакранàцца.
соприкосновение—датыкàнне, дакранàнне.
соприкосновенный *перен.*—датычны.
сопроводительный—суправаджàльны.
сопроводить—суправадзіць.
сопровождать—суправаджàць.
сопровождение—суправаджэнне.
сопротивление—супраціўлѐнне.
сопротивляться—супраціўлàцца.
сопутствовать—спадарòжнічаць.
сопутствующий—спадарòжніцкі, спадарòжнічы.

сор—смѐцце, смяццё.
соразмерить—суразмѐрыць.
соразмерность—суразмѐрнасць.
соразмерный—суразмѐрны.
соразмерять—суразмѐрваць.
соратник—саратнік, паплѐчнік.
сорванец—дурасвѐт, пракуда.
сорвать—сарваць.
сорваться—сарвацца.
сорви-голова—сарві-галава, прайдзі-свет.
сорганизовать—з'арганізаваць.
соревнование—спаборніцтва.
соревноваться—спаборнічаць.
соринка—смяцінка, парушынка.
сорить—смѐціць, насмѐчваць.
сорный—смяццёвы; сорные травы—пустазѐлле.
сорок —сорак.
сорока *зоол.*—сарока.
сороковой—саракавы.
сороколетний—саракагадовы.
сорочка—кашуля, сарочка.
сорт—сорт, гатунак.
сортировать—сартаваць.
сортировка 1.—сартаванне; 2. *(машина)*—сартыроўка.
сортировочный—сартыровачны.
сортировщик—сартыроўшчык.
сортовой: сортовое железо—сартавое жалѐза.
сортоиспытание—сортавыпрабаванне.
сосать—ссаць, смактаць.
сосватаць—сасватаць.
сосед—сусѐд.
соседка—сусѐдка.
соседний—сусѐдні.
соседский—сусѐдскі.
соседство—сусѐдства.
сосиска—сасіска.
соска—соска.
соскабливать—саскрэбваць, саскоблівацъ.
соскакивать—саскокваць.
соскальзывать—саслізгваць.
соскоблить—саскрэбці, саскабліць.
соскользнуть—саслізгнуць.
соскочить—саскочыць.
соскрести—саскрэбці.
соскучиться—засумаваць, занудзіцца, замаркоціцца.
сослагательный: сослагательное наклонение *грам.*—умоўны лад.
сосланный—сасланы.
сослать—сасладь.
сослаться *(на что либо)*—спаслацца.
сословие *истор.*—саслоўе.
сословный—саслоўны.
сослуживец—таварыш па службе.
сослуживица—таварышка па службе.
сослужить *(службу)*—удружыць, зрабіць паслугу.
сосна—сасна, хвоя.
со-сна—спрасонку.
сосновый—сасновы, хваёвы.
соснуть *разг.*—крыху паспаць, заснуць.
сосок *анат.*—сысок.
сосредоточение—сканцэнтраванне, згрупаванне.
сосредоточенно—пільна, уважліва.
сосредоточенность—сканцэнтраванасць, згрупаванасць.
сосредоточенный—сканцэнтраваны, згрупаваны.
сосредоточивание—сканцэнтроўванне, групаванне.
сосредоточивать—сканцэнтроўваць, канцэнтраваць, згрупоўваць.
сосредоточиваться—канцэнтраваць увагу, накіроўваць увагу.

сосредоточить—сканцэнтраваць, згрупаваць.
сосредоточиться—сканцэнтраваць увагу, накіраваць увагу.
состав—склад, састаў; личный состав—асабовы склад; подвижной состав *ж.-д.*—рухомы састаў; состав преступления—наяўнасць злачынства.
составитель 1. *(аўтар)*—укладальнік, складальнік; 2. *(поездов)*—саставіцель.
составить 1. *(соединить вместе)*—саставіць; 2. *(книгу, словарь)*—скласці, укласці; 3. *(представить собою)*—скласці; это составит большую сумму—гэта складзе вялікую суму.
составление 1.—састаўленне; 2. *(книги, словаря)*—складанне, укладанне.
составлять 1. *(соединять вместе)* — састаўляць; 2. *(книгу, словарь)* — складаць, укладаць; 3. *(представлять собою)*—складаць.
составной—састаўны.
состариться—састарэцца, пастарэць.
состояние 1. *(положение)*—стан, становішча; 2. *(имущество)*—маёмасць; быть в состоянии—магчы, здолець.
состоятельность 1. *(кредитора) ком.*—выплатаздольнасць; 2. *(зажиточность)*—заможнасць.
состоятельный 1.—выплатаздольны; 2.—заможны.
состоять 1. *(заключать в себе)*—складацца, змяшчаць; книга состоит из пяти глав—кніга складаецца з пяці раздзелаў, кніга змяшчае пять раздзелаў; 2. *(быть)*—быць; состоять членом общества—быць членам таварыства.
состояться—адбыцца.
сострадание—літасць, міласэрдзе.
сострадательный—літасцівы, міласэрны, жаласлівы.
состричь—састрыгчы.
состряпать—згатаваць.
состязание—спаборніцтва, выпярэдніцтва.
состязаться—спаборнічаць.
сосуд—сасуд, посуд, пасудзіна; кровеносный сосуд—кравяносны сасуд.
сосудистый—сасудзісты.
сосулька *(ледяная)*—лядзяк.
сосун—сысун.
сосуществование—суіснаванне.
сосцы—сасцы, саскі.
сосчитать—злічыць, пералічыць.
сосчитывать—злічваць, пералічваць.
сотворение—стварэнне.
сотворить—стварыць.
сотенный—соценны.
соткать—саткаць, выткаць.
сотня—сотня.
сотоварищ—сатаварыш.
сотовый: сотовый мёд—сотавы мёд.
сотрудник—супрацоўнік.
сотрудница—супрацоўніца.
сотрудничать—супрацоўнічаць.
сотрудничество—супрацоўніцтва.
сотрясать—трэсці, устрасаць.
сотрясение 1.—страсанне; 2. *псих.*—узрушэнне.
соты—соты.
сотый—соты.
соумышленник—сумышленік.
соус—соус, падліўка
соусник—соуснік.

соучаствовать—саўдзѐльнічаць.
соучастие—саўдзѐльніцтва.
соучастник—саўдзѐльнік.
соучастница—саўдзѐльніца.
софизм—сафізм.
софист—сафіст.
софистика—сафістыка.
соха—сахà.
сохнуть—сòхнуць.
сохранение—захавàнне.
сохранить—захавàць.
сохраниться—захавàцца.
сохранность—захòўнасць.
сохранять—захòўваць.
сохраняться—захòўвацца.
соцбытовой (*социально-бытовой*): соцбытовой сектор—соцбытавы сектар.
соцветие—суквѐцце.
соцвос (*социальное воспитание)*—соцвы̀х (*социяльнае выхаванне*).
соцдоговор (*социалистический договор)*—соцдагавòр (*социялістычны дагавор*).
социал-демократ—соция̀л-дэмакрàт.
социалдемократический—социялдэмакратычны.
социалдемократия—социялдэмакрàтыя.
социализацыя—социялізàцыя.
социализировать—социялізавàць.
социализм—социялізм.
социалист—социяліст.
социалистический—социялістычны; социалистическое государство—социялістычная дзяржава; социалистическое соревнование—социялістычнае спаборніцтва.
социалистка—социялістка.
социал-патриот—соция̀л-патрыёт.
социал-пацифист—соция̀л-пацыфіст.
социал-предатель—соция̀л-здрàднік.
социал-революционер—соция̀л-рэволюцыянѐр.
социал-соглашатель—соция̀л-згòднік.
социал-фашист—соция̀л-фашы̀ст.
социальный—соция̀льны.
социолог—сацыёлаг.
социология—социялòгія.
соцсоревнование (*социалистическое соревнование)*—соцспабóрніцтва (*социялістычнае спаборніцтва).*
соцстрахование (*социальное страхование*)—соцстрахавàнне (*социяльнае страхаванне).*
соцстроительство (*социалистическое строительство*—соцбудаўніцтва (*социялістычнае будаўніцтва*).
сочетание—спалучэ̀нне.
сочетать—спалучàць.
сочетаться—спалучàцца.
сочинение 1. (*произведение*)—твор; 2. *грам.*—сачынéнне.
сочинитель 1. (*автор*)—пісьмѐннік; 2. *перен., разг.*—вы̀думшчык.
сочинить 1.—склàсці, напісàць; 2. *перен., разг.*—вы̀мысліць, вы̀думаць.
сочинять 1.—складàць, пісàць; *перен., разг.*—вымышля̀ць, выдумля̀ць.
сочиться—сачы̀цца.
сочленение *анат.*—сучлянѐнне.
сочность—сòчнасць, сакавітасць.
сочный—сòчны, сакавіты.
сочувственно—спачувàльна, спагàдліва, спагàдна.
сочувственный—спачувàльны, спагàдлівы, спагàдны.

сочувствие—спачуванне, спагадлівасць, спагаднасць.
сочувствовать—спачуваць, спагадаць.
сочувствующий—спачуваючы.
сошник—сашнік, лямёх, нарог.
Союз *Советских Социалистических Республик (СССР)*—Саюз *Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік (СССР).*
союз 1.—саюз; 2. *грам.*—злучнік.
союзник—саюзнік.
союзница—саюзніца.
союзнический—саюзніцкі.
союзный—саюзны.
соя *бот.*—соя.
спадание—спаданне.
спадать—спадаць.
спазма—спазма.
спазматический—спазматычны.
спаивать I. (*кого либо*)—спойваць.
спаивать II. (*металлы*)—спайваць.
спай *тех.*—спай.
спайка—спайка.
спалзывать—споўзваць.
спалить—спаліць.
спальный—спальны.
спальная—спальня.
спаренный—спараваны; спаренная езда *ж.-д.*—спараная язда.
спаржа *бот.*—спаржа.
спаривание—спароўванне.
спаривать (*животных*)—спароўваць, параваць.
спартакиада *спорт.*—спартакіяда.
спартаковец—спартакавец.
спаривать—спорваць.
спасание—ратаванне.
спасательный—ратавальны.
спасать—ратаваць.
спасаться—ратавацца.
спасение—ратунак, ратаванне паратунак.
спасибо—дзякуй.
спаситель—ратаўнік, збавіцель.
спасительный—ратаўнічы.
спасти—выратаваць.
спастись—адратавацца, выратавацца.
спасть—спасці.
спать—спаць.
спаянный—спаяны.
спаяць—спаяць.
спевка—спеўка.
спекание *тех.*—спяканне.
спектакль—спектакль.
спектр *физ.*—спектар.
спектральный—спектральны.
спекулировать—спекуляваць.
спекулянт—спекулянт.
спекулянтка—спекулянтка.
спекулянтский—спекулянцкі.
спекулятивный—спекулятыўны.
спекуляция—спекуляцыя.
спеленать—спавіць.
спелость—спеласць, даспеласць.
спелый—спелы, даспелы.
сперва—спярша, наперад, спачатку.
спереди—спераду, уперадзе.
спереть 1. (*сдавить*)—сціснуць; спёрло дыхание—дух заняло; 2. *разг.* (*украсть*)—сцібрыць, сперці.
сперма *физл.*—сперма.
спёртый (*о воздухе*)—сперты, удушны.
спесивый—ганарысты, фанабэрысты.
спесь—ганарыстасць, фанабэрыя.
спеть I. (*пропеть*)—праспяваць, спяяць.
спеть II. (*созревать*)—спець, выспяваць, даспяваць.
спеться—саспявацца, спяяцца.

спец—спец.
специализацыя—спецыялізàцыя.
специализироваться—спецыялізавàцца.
специалист—спецыяліст.
специалистка—спецыялістка.
специально—спецыяльна.
специальность—спецыяльнасць.
специальный—спецыяльны.
специфический—спецыфічны.
спецкор (*специальный корреспондент*)—спецкòр (*спецыяльны карэспандэнт*).
спецодежда—спецвòпратка.
спецставка—спецстàўка.
спечь—спячы.
спечься—спячыся.
спешиваться—спèшвацца.
спешиться—спèшыцца.
спешить—спяшàцца.
спешка—спèшка.
спешно—спèшна.
спешность—спèшнасць.
спешный—спèшны.
спиваться—співàцца.
спиж *бот.*—спіж, свізіна.
спиливать—спілòўваць.
спилить—спілавàць.
спина—спіна.
спинка—спінка.
спинной—спінны.
спираль—спірàль.
спиральны—спірàльны.
спирант *лингв.*—спірàнт.
спиритизм—спірытызм.
спиритуализм *филос.*—спірытуалізм.
спирт—спірт.
спиртной, спиртный—спіртны; спиртные напитки — спіртныя напіткі.
спиртовка—спіртòўка.
списать—спісàць
списаться—спісàцца.
список—спісак, спіс.
списывание—спісванне.
списывать—спісваць.
списываться—спісвацца.
спиться—спіцца.
спихивать—спіхваць, спіхàць.
спихнуть—сапхнуць.
спица 1. *(колесная)*—спіца; 2. *(вязальная)*—прутòк.
спич—спіч.
спичечница—запàлачніца, сярнічніца.
спичечный—запàлачны.
спичка—запàлка, сярнічка.
сплав—сплàў.
сплавить—сплàвіць.
сплавлять—сплаўляць.
сплавной—сплаўны.
сплавщик 1. (*работник на плотах*)—плытагòн, плытнік; 2. *(металла)*—сплàўшчык.
спланировать I. *тех.*—спланавàць.
спланировать II. *ав.*—спланіраваць.
сплачивать—шчыльна звязваць, згуртòўваць.
сплёвывать—сплёўваць.
сплеснуть—сплёснуць, выплюхнуць.
сплести—сплèсці.
сплетать—сплятàць.
сплетение—сплацèнне.
сплетни—плёткі.
сплетник—пляткàр.
сплетница—пляткàрка.
сплетничать—пляткàрыць, плёткі развòдзіць.
сплеча—сплячà.
сплин—сплін.
сплотить—шчыльна звязàць, згуртавàць.
сплотка (*лесоматериалов*)—сплытòўванне.
сплоховать *разг.*—схібіць, памыліцца.
сплочение—згуртавàнне.
сплочённость—згуртавàнасць.
сплочённый—згуртавàны.

сплошной—суцэ̀льны, сплошная коллективизация—суцэ̀льная калектывізацыя.
сплошь—скрозь, усця̀ж; сплошь да рядом—скрозь і ўсюды.
сплутовать—змахлява̀ць, ашука̀ць.
сплывать—сплыва̀ць.
сплыть—сплыць, сплы̀сці.
сплюнуть—сплю̀нуць.
сплюснутый—сплю̀шчаны, сляска̀ны, пляска̀ты.
сплюснуть—сплю̀шчыць, спляска̀ць.
сплющенность—сплю̀шчанасць, спляска̀насць.
сплющивать—сплю̀шчваць, сплёскваць.
сплющить—сплю̀шчыць, спляска̀ць.
сподвижник—паплѐчнік, супо̀льнік.
сподвижница—паплѐчніца, супо̀льніца.
сподручный—зру̀чны, падру̀чны.
спозаранку—спазара̀нку.
спокойно—спако̀йна, ці̀ха.
спокойный—спако̀йны, ці̀хі; спокойной ночи—спакойнай ночы, дабра̀нач, до̀брай но̀чы.
спокойствие—спако̀й, ці̀ша.
спокон: спокон веку—спрадвѐку.
споласкивать—спало̀скваць.
сполгоря—споўбяды̀.
сползать—спаўза̀ць, спо̀ўзваць.
сползти—спаўзці̀.
сполна—ца̀лкам.
сполоснуть—спаласну̀ць.
спор—спрэ̀чка; спору нет—бясспрэ̀чна.
спора *бот.*—спо̀ра.
спорадический—спарады̀чны.
спорить—спрача̀цца.
спориться *(о деле)*—спо̀рыцца.
спорный—спрэ̀чны.
споро—спо̀рна.
спороть—спаро̀ць.
спорт—спорт.
спортивный—спарты̀ўны.
спортсмен—спартсмѐн.
спорщик—спрэ̀чнік, спрача̀льнік.
спорый—спо̀рны.
спорынья *бот.*—спарыння̀.
способ—спо̀саб.
способность—здо̀льнасць, зда̀тнасць.
способный—здо̀льны, зда̀тны.
способствовать—садзѐйнічаць, дапамага̀ць, памага̀ць.
споткнуться—спаткну̀цца, спатыкну̀цца.
спотыкаться—спатыка̀цца.
спохватиться—схамяну̀цца, спахапі̀цца.
справа—спра̀ва.
справедливо—справядлі̀ва, папра̀ўдзе.
справедливость—справядлі̀васць.
справедливый—справядлі̀вы.
справиться 1. *(управиться)*—спра̀віцца; 2. *(осведомиться)*—давѐдацца.
справка—давѐдка.
справляться 1. *(управляться)*—спраўля̀цца; 2. *(осведомляться)*—давѐдвацца.
справочник—давѐднік, давѐдачнік.
справочный—давѐдны, давѐдачны.
спрашивать—пыта̀ць, пыта̀цца, запы̀тваць.
спринцовать—спрынцава̀ць.
спринцовка—спрынцо̀ўка.
спровадить—справа̀дзіць, вы̀правадзіць.

спроваживать—справаджваць, выправаджваць.
спровоцировать—справакаваць.
спрос I.—попыт; спрос и предложение—попыт і прапанаванне.
спрос II.: войти без спроса—увайсці без дазволу.
спросить—спытаць, запытаць.
спросонок—спрасонку.
спросонья—спрасоння.
спроста—спросту, папросту.
спрут *зоол.*—спрут.
спрыгивать—саскокваць.
спрыгнуть—саскочыць.
спрыскивать—спырскваць.
спрыснуть—спырснуць.
спрягать *грам.*—спрагаць.
спрягаться *грам.*—спрагацца.
спряжение *грам.*—спражэнне.
спрясть—спрасці.
спрятать—схаваць, захаваць.
спрятаться—схавацца.
спугивать—палохаць, пужаць.
спугнуць—спалохаць, спудзіць.
спуд: под спудом—пад спудам, патаемна.
спуск 1.—спуск; 2. *перен.*—попуск, папусканне; 3.—он спуску не даст—ён не дарue, ен попуску не дасць.
спускать—спускаць.
спускаться—спускацца.
спускной—спускны.
спусковой *тех.*, *воен.*,—спускавы.
спустить—спусціць.
спуститься—спусціцца.
спустя—пачакаўшы, потым, пасля, праз; спустя три года—праз тры гады; спустя рукава—абыяк, як папала, нядбайна.
спутанный 1.—спутаны; 2. *перен.*—зблытаны.
спутать 1.—спутаць; 2. *перен.*—зблытаць.
спутаться 1.—спутацца; 2. *перен.*—зблытацца.
спутник—спадарожнік.
спутница—спадарожніца.
спутывать 1.—спутваць; 2. *перен.* зблытваць.
спутываться 1.—спутвацца; 2. *перен.*—зблытвацца.
спущенный—спушчаны.
спятить: спятить с ума—з глуздоў з'ехаць, звар'яцець.
спячка—спячка.
спящий—які спіць.
сработанность—спрацаванасць.
сработаться—спрацавацца.
сравнение—параўнанне; по сравнению—параўнаўча, у параўнанні.
сравнивание 1.—раўнанне; 2. *(выравнивание)*—раўнаванне, выроўніванне.
сравнивать 1.—раўнаць, параўноўваць; 2. *(делать ровным)*—раўняць.
сравнимый—параўнавальны.
сравнительно—параўнаўча, параўнальна, у параўнанні.
сравнительный—параўнаўчы, параўнальны; сравнительная степень *грам.*—параўнальная ступень.
сравнить—параўнаць, параўнаваць.
сравнять—зраўняць.
сражаться—біцца, ваяваць.
сражение—бой, бітва; поле сражения—поле бітвы.
сразить—паразіць.
сразиться—пачаць бойку (бітву).
сразу—зразу; адразу.
срам—сорам.
срамить—сарамаціць.
срамиться—сароміцца.
срастание—зрастанне.

срастаться—зрòстацца.
срастись—зрасцìся.
сращение—зрашчэ̀нне.
сращивание—зрòшчванне.
сращиваться—зрòшчвацца.
среда 1. *(день недели)*—серадà; 2. *(окружение)*—асярòддзе.
среди 1.—сярòд, пасярòд; 2. *(между)*—між, памìж *(кім, чым)*.
Средиземное море—Міжзѐмнае мора.
средина—сярэ̀дзіна.
среднеазиатский—сярэднеазіяцкі.
средневековый—сярэдневякòвы.
средневековье—сярэ̀днія вякì, сярэдневякòўе.
средневолжский—сярэ̀дневолжскі.
средний—сярэдні; средний род *грам.*—ніякі род.
средостение—сяродсцѐнне.
средоточие—асярòдак.
средство—срòдак, спòсаб.
срез—зрэз.
срезать—зрэ̀заць.
срезать—зрэ̀зваць.
срезаться—зрэ̀зацца.
срисовать—зрысавàць.
срезывать—зрэ̀зваць.
срезываться—зрэ̀звацца.
срисовывать—зарысòўваць.
сробеть—спужàцца, спалòхацца.
сродни: мы сродни—мы родныя, мы радня, мы сваякі.
сродниться—парадніцца.
сродный 1.—рòдны, сваяцкі; 2. *(свойственный)*—уласцівы.
сродство—сваяцтва, зрòднасць.
сроду—зрòду.
срок—тэ̀рмін.
сростись—зрасцìся.
срочно—тэрмінòва.
срочность—тэрмінòвасць.
срочный—тэрмінòвы.
сруб—зруб.
срубать—ссякàць, зрубàць.
срубить—ссячы̀, зрубіць.
срубленный—ссѐчаны, зру̀блены.
срыв—зрыў.
срывать I.—зрывàць.
срывать II.—скòпваць.
срывщик—зры̀ўшчык.
скрыть—скапàць.
сряду—падрàд.
ссадина—ссàдзіна.
ссадить I.—ссадзіць.
ссадить II. *(кожу)*—садрàць.
ссаживать—ссàджваць.
сседаться 1. *(о ткани, коже)*—ссядàцца; 2. *(о молоке)*—збягàцца, адкіпàць.
ссора—свàрка.
ссорить—сварыць.
ссориться—сварыцца.
ссохнуться—ссòхнуцца.
ССП *(Союз советских писателей)*—ССП *(Саюз савецкіх пісьменнікаў)*.
СССР—*(Союз Советских Социалистических Республик)*—СССР *(Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік)*.
ссуда—пазы̀ка.
ссудить—пазы̀чыць.
ссудный: ссудная касса—пазычковая каса.
ссудо-сберегательная касса—пазычàльна-ашчàдная кàса.
ссужать—пазычàць.
ссучить—ссукàць.
ссылать—ссылàць.
ссылаться *(на что, на кого)*—спасылàцца.
ссылка 1. *(высылка)*—ссы̀лка, саслàнне; 2. *(на что-либо)*—спасы̀лка, спасылàнне.

ссыльнопоселенец—ссыльнапасялѐнец.
ссыльный—саслàны, ссы̀льны.
ссыпать—ссы̀паць.
ссыпать—ссыпàць.
ссыпка—ссы̀пка.
ссыпной—ссыпны̀; ссыпной пункт—ссыпны пункт.
ссыхаться—ссыхàцца.
стабилизация—стабілізàцыя.
стабилизировать—стабілізавàць.
стабильность—стабі̀льнасць.
стабильный—стабі̀льны.
ставень—вакѐніца, акòніца.
ставить—стàвіць; ставить в известность—давòдзіць да вѐдама.
ставка 1. *(оклад)*—стàўка; 2. *воен.*—стàўка; 3. *(в игре)*—стàўка.
ставленик—стàўленік.
ставня—вакѐніца, акòніца.
стадион—стадыён.
стадия—стàдыя.
стадный—стàдны.
стадо—стàда, стàтак.
стаж—стаж.
стажёр—стажòр.
стажировать—стажы̀раваць.
стакан 1.—шклянка; 2. *тех.* *(поршня)*—цѐла.
сталелитейный: сталелитейный завод—сталеліцейны завод.
Сталинград—Сталінгрàд.
сталинский—стàлінскі.
сталь—сталь; наваривать сталью—стàліць.
стальной—сталёвы, стальны̀.
сталкивать—спіхàць; саштурхàць.
сталкиваться—сутыкàцца.
стало быть—выхòдзіць, знàчыцца.
стамеска *тех.*—стамѐска, дòлатца.
стан I. *(фигура)*—стан, пòстаць.
стан II. *(комплект колёс)*—стан.
стан III. *воен.*—стан, лàгер.
стан IV. *тех.*—стан.
